УДК 94:327((47+57)+438)"192":929*Л. Абаленскі

**М. М. Мязга**
Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

# Л. АБАЛЕНСКІ – ПАЎНАМОЦНЫ ПРАДСТАЎНІК САВЕЦКАЙ РАСІІ / СССР У ПОЛЬШЧЫ

*У артыкуле ахарактарызавана дзейнасць на пасадзе савецкага паўнамоцнага прадстаўніка ў Варшаве Л. Абаленскага. Выяўлены тыя аспекты савецка-польскіх адносін, якія знаходзіліся ў цэнтры яго дзейнасці. Устаноўлена, што Л. Абаленскі, як прадстаўнік Савецкай дзяржавы ў Польшчы, лічыў магчымым паляпшэнне польска-савецкіх адносін, але на савецкіх умовах, у аснове якіх была рэвізія Рыжскага дагавора. Фактычна, ён прызнаў немагчымасць дасягнення гэтай мэты, што і стала прычынай яго просьбы аб адстаўцы.*

Рыжскі мірны дагавор паміж Савецкай Расіяй і Савецкай Украінай, з аднаго боку, і Польшчай с другога прадугледжваў усталяванне ў бліжэйшы час дыпламатычных адносін паміж краінамі, якія яго падпісалі. У сувязі з гэтым павінен быў адбыцца абмен дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі. Масква была зацікаўлена ў тым, каб гэтае палажэнне дагавора было выканана як можна хучэй. Тым самым ствараўся важны міжнародны прэцэдэнт прызнання савецкага расійскага ўрада дастаткова буйной капіталістычнай краінай Еўропы.

Для развіцця польска-савецкіх адносін на новым мірным этапе важна было, хто ўзначаліць прадстаўніцтва Савецкай Расіі ў Варшаве і Польшчы ў Маскве. Гэта разумела савецкае кіраўніцтва і літаральна адразу пасля заключэння Рыжскага дагавора занялося пытаннем прызначэння кіраўніка паўнамоцнага прадстаўніцтва ў Варшаве. Ужо 21 сакавіка 1921 г. Палітбюро ЦК РКП(б) было прынята рашэнне аб прызначэнні паўнамоцным прадстаўнікам РСФСР у Польшчы Леаніда Абаленскага [1]. Дадзены выбар не быў выпадковым. Л. Абаленскі прымаў удзел у савецка-польскіх перамовах у Рызе і лічыўся сярод савецкіх дыпламатаў адным з найбольш дасвечаных спецыялістаў па польскай праблематыцы. Так што выбар яго кандыдатуры на пасаду паўнамоцнага прадстаўніка РСФСР у Польшчы прадстаўляецца абгрунтаваным. Аднак Палітбюро дастаткова хутка памяняла сваё рашэнне. Наркам замежных спраў Савецкай Расіі Георгій Чычэрын прапанаваў прызначыць паўпрадам у Варашаву Льва Карахана. 5 красавіка Палітбюро разгледзела гэтую прапанову і зацвердзіла названую кандыдатуру [2]. На наш погляд, змена кадравага рашэння Палітбюро на карысць Л. Карахана падкрэслівае, што савецкае кіраўніцтва надавала вялікае значэнне наладжванню адносін з Польшчай у той момант. Новы паўпрад займаў тады пасаду намесніка наркама замежных спраў і яго прызначэнне кіраўніком савецкай дыпламатычнай місіі ў Варшаве павінна было падкрэсліваць значымасць гэтай пасады. Напэўна, Масква спадзявалася, што дадзены жэст падштурхне Варшаву ў найкарацейшы час рэалізаваць палажэнне дагавора аб абмене дыпламатычнамі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прадстаўніцтвамі. Аднак вырашэнне гэтага пытання зацягнулася. Толькі ў пачатку жніўня савецкая дыпламатычная місія прыбыла ў Варшаву, а польская – у Маскву.

Такім чынам, Л. Абаленскаму не выпала ўзначаліць савецкае паўпрадства ў Варшаве ў момант усталявання дыпламатычных адносін паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. Але ён увайшоў у склад савецкай дыпламатычнай місіі як саветнік паўпрадства. Знаходжанне Л. Карахана на пасадзе паўпрада ў Варшаве аказалася непрацяглым. У студзені 1922 г. адбыўся яго ад'езд у Маскву, хаця афіцыйна ён заставаўся паўпрадам. Л. Абаленскі заняў пасаду паверанага ў справах РСФСР у Польшчы. Менавіта ў гэты час пачыналіся савецка-польскія гандлёвыя перамовы. 23 лютага савецкае прадстаўніцтва ў Варшаве накіравала ноту польскаму міністэрству замежных спраў, у якой быў названы склад савецкай дэлегацыі на вядзенне гандлёвых перамоў з Польшчай. Сярод яе сябраў быў і Л. Абаленскі [3, с. 141]. Аднак перамовы вельмі хутка закончыліся безвынікова.

Адной з найбольш востных праблем у савецка-польскіх адносінах была дзейнасць нерэгулярных узброеных атрадаў у пагранічных раёнах. Л. Абаленскі актыўна адстойваў пазіцыю савецкага кіраўніцтва па гэтаму пытанню. У яе аснове былі абвінавачванні ў адрас Польшчы ў падтрымцы дзейнасці антысавецкіх фармаванняў з яе тэрыторыі і адхіленне абвінавачванняў савецкага ўрада ў арганізацыі партызанскага руху на тэрыторыі Польшчы. 21 чэрвеня 1922 г. была накіравана нота паверанага ў справах РСФСР у Варшаве міністру замежных спраў Польшчы Канстанту Скірмунту, у якой даказвалася неабгрунтаванасць абвінавачванняў польскім урадам савецкага боку ў падтрымцы партызанскага руху ва ўсходніх ваяводствах Польшчы. У той жа час, польскі ўрад абвінавачваўся ў арганізацыі нападаў на савецкую тэрыторыю [3, с. 165–166]. Сам паверны ў справах РСФСР у Варшаве лічыў неабходным правядзенне палітыкі, накіраванай на аслабленне пазіцый Польшчы на тэрыторыі яе ўсходніх ваяводстваў, у тым ліку і з дапамогай г. з. "актыўнай разведкі". Такія дзеянні ён разглядаў як лепшы сродак, каб паралізаваць актыўнасць польскай палітыкі ва ўсходнім напрамку [4, л. 48].

Летам 1922 г. Л. Абаленскі ўключыўся ў работу па падрыхтоўцы канферэнцыі па раззбраенню, прапанаваную савецкім урадам. 29 жніўня ён як паверны ў справах атрымаў ноту ад міністра замежных спраў Габрыэля Нарутовіча аб згодзе Польшчы прыняць удзел у Маскоўскай канферэнцыі па раззбраенню [3, с. 171]. Будучы кіраўніком савецкай місіі ў Варшаве, Л. Абаленскі прымаў удзел у падрыхтоўцы і ажыццяўленні візітаў у Варшаву намесніка наркама замежных спраў Максіма Літвінава ў пачатку жніўня і Г. Чычэрына ў канцы верасня 1922 г. Але гэтыя візіты не аказалі станоўчага ўплыву на савецка-польскія адносіны.

12 кастрычніка Палітбюро прыняло рашэнне прызначыць на пасаду паўпрада ў Варшаве Л. Абаленскага, які да гэтага выконваў абавязкі часовага паверанага ў справах [5]. Пытанне пра прычыны замены савецкага паўпрада ў Варшаве патрабуе дадатковага вывучэння. Магчыма, быў улічаны вопыт узаемадзеяння Л. Абаленскага з польскімі дыпламатамі ў ходзе рыжскіх перамоваў, яго праца на пасадзе саветніка паўпрадства і паверанага ў справах у Варшаве. Ён мог паспяхова замяніць Л. Карахана, які, пры дэфіцыце дыпламатычных кадраў у Савецкай дзяржаве, быў запатрабаваны на розных напрамках савецкай знешняй палітыкі. Аднак у сувязі з прызначэннем Л. Абаленскага паўпрадам паўстаў востры дыпламатычны канфлікт, звязаны з акрэдытацыяй у Варшаве новага савецкага паўнамоцнага прадстаўніка. Начальнік польскай дзяржавы Юзаф Пілсудскі адмовіўся прыняць у яго даверчыя граматы, даручыўшы гэта зрабіць міністру замежных спраў. Масквой гэта было ўспрынята як жаданне падкрэсліць няроўнасць савецкага прадстаўніка ў параўнанні з іншымі пасланнікамі. Л. Абаленскі ў знак пратэсту пакінуў Варшаву. Пасля гэтага ўрад Польшчы адклікаў з Масквы польскага паверанага ў справах Рамана Кноля [3, с. 189–190]. 7 лістапада ў Маскве была атрымана нота польскага ўрада ў сувязі з ад'ездам з Варшавы савецкага паўпрада Л. Абаленскага. Віна за дыпламтычны інцыдэнт ускладался на савецкі бок. Пры гэтым Варшава выказвала спадзяванне на хуткае ўрэгуляванне канфлікту [3, с. 187–188]. Канфлікт з дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі быў

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

урэгуляваны ў час Маскоўскай канферэнцыі па рззбраенню ў снежні 1922 г. у выніку перамоў паміж намеснікам наркама замежных спраў РСФСР М. Літвінавым і кіраўнікам польскай дэлегацыі Янушам Радзівілам. 4 студзеня Л. Абаленскі ў якасці паўпрада ўрычыў даверчыя граматы прэзідэнту Польшчы Станіславу Вайцахоўскаму, а Р. Кноль як паверанны ў справах Польшчы быў прыняты М. Літвінавым [3, с. 190].

З пачатку 1923 г. цэнтральнае месца ў дзейнасці савецкага паўпрадства ў Варшаве займаюць падзеі, звязаныя з Рурскім крызісам. Яшчэ 9 студзеня Л. Абаленскі паведаміў у Маскву аб тым, што згодна яго інфармацыі Францыя мае намер у бліжэйшы час пачаць уварванне ў Рур, а “польская падтрымка”, па словах паўпрада, “пойдзе ў напрамку заняцця Данцыга (на ўсякі выпадак, як базу для французскага флота), нямецкай часткі Верхняй Сілезіі”. Далей Л. Абаленскі са спасылкай на атрыманыя агентурныя звесткі пісаў аб актыўнай падрыхтоўцы польскага генеральнага штаба да мабілізацыі некалькіх уростаў рэзервістаў [6, л. 11]. На пачатку Рурскага крызісу савецкі паўпрад ў Варшаве лічыў цалкам магчымым польскае ўмяшанне ў франка-германскі канфлікт і актыўна даводзіў дадзеную пазіцыю да кіраўніцтва ў Маскве. 16 студзеня ў тэлеграме ў наркамат замежных спраў Л. Абаленскі зноў піша пра падрыхтоўку палякамі наступлення на Данцыг і нямецкую Сілезію, указвае на тое, што ў Польшчы ўжо адбываецца мабілізацыя і армейскія злучэнні рухаюцца да германскай граніцы [6, л. 16]. У Маскве некалькі па-іншаму ацэньвалі пазіцыю Польшчы, лічылі яе больш стрыманай. 14 студзеня член калегіі НКЗС Віктар Коп пісаў паўпраду ў Варшаве, што польскі прадстаўнік у Маскве запэўніваў Г. Чычэрына ў міралюбнасці польскага ўрада. Таксама польскія ўлады праяўлялі асаблівую прадбачлівасць у адносінах да савецкага паўпрада ў Варшаве. Усё гэта сведчыла, на думку В. Копа, пра тое, што “Польпра даволі цвяроза ўлічвае становішча Польшчы, як становішча некаторай ізаляцыі і вельмі мае патрэбу ў карэктных адносінах з намі”. Пры гэтым Савецкі Саюз разлічваў, па словах В. Копа “праціснуць сякія–такія далікатныя пытанні” ў адносінах з Польшчай [7, л. 3]. Мелася на ўвазе дабіцца згоды Польшчы на перагляд савецкіх матэрыяльных абавязацельстваў па Рыжскаму дагавору.

Пры гэтым у Маскве лічылі неабходным даць зразумець польскаму ўраду, што СССР не будзе абыякавым у выпадку ўмяшання Польшчы ў Рурскі крызіс. Член калегіі НКЗС Якаў Ганецкі 16 студзеня паведаміў паўпраду ў Варшаве пра рашэнне савецкага ўрада папярэдзіць палякаў, “што мы не можам быць індыферэнтнымі да плануемай у іх мабілізацыі і, калі такая адбудзецца, вымушаныя будзем зрабіць адпаведныя высновы”. Перад Л. Абаленскім ставілася задача давесці гэтую інфармацыю да міністра замежных спраў Аляксандра Скшыньскага [7, л. 6]. Таксама намячаліся меры на выпадак польскага выступлення супраць Германіі. 18 студзеня 1923 г. Палітбюро абмяркоўвала сітуацыю ў сувязі з акупацыяй Францыяй Рура. Прынятыя рашэнні пацвярджалі апасенні савецкага кіраўніцтва адносна агрэсіўных планаў Польшчы. Палітбюро даручыла РВСР “у тэрміновым парадку распрацаваць план мабілізацыі (прыкладна двух узростаў) і засяроджвання неабходных сіл на Заходнім фронце ў выпадку, калі б Польшча да гэтага прымусіла”. Таксама меркавалася ўмацаваць Заходнюю акругу групай “адказных камуністаў палітработнікаў”. Палітбюро вырашыла разгарнуць кампанію ў прэсе пад кантролем Л. Троцкага, у якой выкрыць “польскіх авантурыстаў”, якія маюць намер кінуць польскія войскі на Германію. Паўпраду ў Германіі М. Крэсцінскаму даручалася высветліць пазіцыю германскага ўрада ў сувязі з рурскімі падзеямі і “магчымасцю выступлення Польшчы” [8].

У канцы студзеня можна заўважыць змены ў ацэнцы пазіцыі Польшчы ў сувязі з Рурскім крызісам савецкім цэнтральным кіраўніцтвам. 30 студзеня Я. Ганецкі пісаў паўпраду ў Варшаве, што ў палякаў, з аднаго боку, маецца “дамова з Францыяй у адпаведны момант захапіць Данцыг і Верхнюю Сілезію”. І Польшча робіць падрыхтоўку, каб выступіць супраць Германіі. Але Польшчы складана рашыцца выступіць, бо Англія “ўзмоцнена рэкамендуе ёй быць нейтральнай”. Л. Абаленскаму даручалася праінфармаваць польскі ўрад, што СССР у франка-германскім канфлікце вырашыў захоўваць строгі нейтралітэт. Але пры гэтым

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

неабходна было падкрэсліць, што мабілізацыя ў Польшчы і захоп ёю новых тэрыторый “не могуць для нас быць абыякавымі” [7, л. 15–16]. Такім чынам, Л. Абаленскі ад імя савецкага ўрада фактычна павінен быў прапанаваць Польшчы ўзаемны нейтралітэт у германа-французскім канфлікце. Але пры гэтым падкрэслівалася, што Савецкі Саюз не застанецца нейтральным, калі Польшча паспрабуе захапіць германскія тэрыторыі.

Паўнамоцны прадстаўнік СССР у Варшаве таксама прыйшоў да высновы, што Польшча не імкнецца актыўна ўмяшацца ў Рурскі крызіс. Л. Абаленскі пісаў у Маскву Я. Ганецкаму 6 сакавіка, што Польшча вельмі моцна працівіцца магутнаму французскаму націску з патрабаваннем неадкладнай акцыі садзейнічання ў Рурскім пытанні. На ягоную думку, В. Сікорскі і Ю. Пілсудскі не хочуць нічога рабіць супраць Германіі, бо абодва ведаюць складанасць унутранага становішча Польшчы, і “абодва баяцца нашага ўмяшання” [6, л. 49]. У тэлеграме ад 13 сакавіка на імя таго ж Я. Ганецкага паўпрад ў Варшаве робіць выснову, што ўсе польскія ваенныя прыгатаванні зроблены пад націскам Францыі і на французскія грошы, і з'яўляюцца не больш, чым дэманстрацыяй. Акрамя таго, на думку Л. Абаленскага, Польшча апынулася не ў стане весці наступальную вайну ў сілу эканамічных прычын. Ён адзначаў: “Пачынаючы са студзеня 1923 г., дзякуючы фінансаваму краху польскай валюты і цяжкаму эканамічнаму становішчу ў краіне, польскі генеральны штаб пераканаўся, што думаць і весці наступальную вайну і наогул ўцягвацца ў вайну Польшча ў цяперашні час не можа” [6, л. 57, 58, 59]. Неабходна адзначыць, што паўпрад дастаткова дакладна вызначыў польскую пазіцыю па рурскаму пытанню ў той момант. Савецкае кіраўніцтва ставіла перад паўпрадам у Варшаве задачу сачыць за магчымымі ваеннымі прыгатаваннямі Польшчы. 9 сакавіка ў тэлеграме Я. Ганецкага яму даручалася праверыць звесткі “з сур'ёзных крыніц пра намер Польшчы напасці на нас у маі” [7, л. 43]. У канцы сакавіка Л. Абаленскі зноў схіляецца да пункту гледжання, што Польшча можа выступіць супраць Германіі. Ён пісаў у Маскву 27 сакавіка, што палякі маюць намер захапіць Данцыг. Канчаткова пытанне пра выступленне супраць Германіі будзе вырашана ў залежнасці ад пазіцыі, якую зойме Англія [6, л. 62].

У лютым актуалізавалася пытанне аб польска-савецкіх гандлёвых перамовах. Пасля працяглых правалочак яны пачаліся 9 сакавіка і вяліся ў Варшаве. Л. Абаленскі з’яўляўся кіраўніком савецкай дэлегацыі. У інструкцыях, якія ён атрымаў з Масквы, ставілася задача дабівацца ў час перамоў змягчэння савецкіх абавязацельстваў па Рыжскаму дагавору [7, л. 49]. Гэта была вельмі складаная задача. Польскі ўрад настойліва патрабаваў перадачы савецкім бокам матэрыяльных і культурных каштоўнасцяў у адпаведнасці з Рыжскім дагаворам. Розныя падыходы бакоў да выканання Рыжскага дагавора прывялі да хуткага зрыву перамоў. Л. Абаленскі з’вязваў гэта і з агульным станам савецка-польскіх адносін. Ён пісаў у НКЗС, што “страх і недавер з'яўляюцца асноўным стымулам польскай палітыкі ў дачыненні да нас” [6, л. 43].

28 мая 1923 г. у Польшчы быў сфарміраваны новы ўрад на чале з Вінцэнты Вітасам. У ім пераважалі прадстаўнікі польскіх правых палітычных партый. Гэта парадзіла ў кіраўніцтва Савецкага Саюза спадзяванні на паляпшэнне адносін з Польшчай. Гэтыя спадзяванні грунтаваліся на тым, што польскі правы палітычны лагер разглядаў Германію ў якасці галоўнага праціўніка Польшчы. Каб супрацьстаяць Германіі, трэба было, на думку правіцы, дабівацца нармалізацыі адносін з Расіяй. Аднак савецкі паўпрад у Варшаве не раздзяляў пункту гледжання, згодна якому прыход да ўлады ўрада Вітаса будзе спрыяць польска-савецкаму збліжэнню. Ён лічыў, што, на думку польскіх правых палітыкаў, “адзінства нашых інтарэсаў з Польшчай супраць Германіі рана ці позна пад кіраўніцтвам Францыі павінна будзе абавязкова выявіцца”. Такім чынам, асновай для польска-расійскага збліжэння, на думку Л. Абаленскага, польская правіца лічыла працідзеянне германскай пагрозе. Для гэтага Расія павінна будзе пайсці на паляпшэнне адносін з Польшчай і Францыяй ва ўрон адносінам з Германіяй. А далей у сваёй тэлеграме Л. Абаленскі абгрунтавана заўважыў, што “наша агульная лінія міжнароднай палітыкі накіравана ў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

працілеглы бок, і цяжка чакаць суб'ектыўнага і аб'ектыўнага паляпшэння стаўлення да нас Польшчы" [6, л. 2]. Пасля прыхода да ўлады ўрада В. Вітаса Л. Абаленскі 12 чэрвеня ў тэлеграме ў Маскву на імя Л. Карахан адзначаў, што міністр замежных Марыян Сейда ў сваёй палітыцы ставіць задачу падрыхтоўваць глебу для ўрэгулявання адносін з будучай паслябальшавіцкай Расіяй. Хаосам і слабасцю, якія, на думку палякаў, будуць характэрныя для Расіі ў момант падзення ўлады бальшавікоў, неабходна было скарыстацца для паскарэння справы аб'яднання "ўсходніх ускраін" з астатняй Польшчай. Улічваючы такую пазіцыю польскага міністра замежных спраў, які з'яўляўся прадстаўніком польскага правага палітычнага лагера, Л. Абаленскі рабіў выснову, што савецкаму кіраўніцтву варта пакінуць спробы заваяваць сімпатыі польскай нацыянальнай дэмакратыі. Да таго ж, савецкі паўпрад указваў і на класавую варожасць эндэкаў да Савецкай дзяржавы, што таксама рабіла праблематычным наладжванне супрацоўніцтва з новым польскім урадам [6, л. 106]. Скептыцызм савецкага паўпрада адносна паляпшэння савецка-польскіх адносін у сувязі з прыходам да ўлады ўрада В. Вітаса цалкам пацвердзіўся. Хоць пад час першай сустрэчы з Л. Абаленскім, па словах савецкага паўпрада, М. Сейда дэманстраваў гатоўнасць да паляпшэння двухбаковых адносін. Праўда, пры гэтым польскі міністр падкрэсліў, што асновай для польска-савецкага збліжэння павінна стаць дакладнае выкананне Рыжскага дагавора [6, л. 102]. Але Л. Абаленскі добра ведаў, што агульная стратэгічная лінія савецкай палітыкі накіравана на ануляванне савецкіх плацяжоў Польшчы. Гэтая лінія была дакладна выкладзена ў інструкцыі да гандлёвых перамоў, якую Л. Абаленскі атрымаў 13 чэрвеня. Савецкае кіраўніцтва звязвала заключэнне гандлёвага дагавора са згодай Польшчы на перагляд савецкіх матэрыяльных абавязацельстваў па Рыжскаму дагавору. Паўпрад павінен быў прама заявіць палякам, што ў выпадку іх нязгоды "Расія і далей будзе сабатаваць мірны дагавор, і Польшча атрымае мізэр" [7, л. 148–149].

Восенню 1923 г. характар польска-савецкіх адносін у рашаючай ступені вызначаўся палітычным крызісам у Германіі. У Варшаве справядліва лічылі, што перамога рэвалюцыі ў Германіі шмат у чым будзе залежаць ад таго, ці ўдасца СССР аказаць дапамогу рэвалюцыйным сілам Германіі. Для польскага ўрада важнейшай становіцца задача стварыць бар'ер паміж СССР і рэвалюцыйнай Германіяй. Гэта выдатна разумеў Л. Абаленскі. У тэлеграме, накіраванай 28 верасня В. Копу, паўпрад у Варшаве пісаў, што ў польскай палітыцы "чырвонай ніткай праходзіць імкненне ўсе намаганні накіраваць на тое, каб гэтай змычцы перашкодзіць". Закранаючы пытанне пра транзіт, Л. Абаленскі падкрэсліваў: "У сувязі з пагрозай германскай рэвалюцыі нават фінансавыя меркаванні не маглі б перамагчы страху палякаў перад змычкай СССР і Германіі" [6, л. 205, 206]. Варта прызнаць, што прагнозы Л. Абаленскага адносна пазіцыі Польшчы ў сувязі з падзеямі ў Германіі аказаліся досыць дакладнымі. У Маскве ж спадзяваліся, што ўдасца дамовіцца з палякамі па германскай праблематыцы за кошт эканамічных дывідэнтаў. В. Коп 12 кастрычніка паведаміў Л. Абаленскаму аб прынятым Масквой рашэнні "весці перамовы з польскім урадам на шырокім базісе з канчатковай мэтай дамагчыся як вольнага транзіту ў Германію, так і гарантыі неўмяшання ва ўнутраныя справы Германії". Ён пісаў аб сваім маючым адбыцца візіце ў краіны Прыбалтыкі і Польшчу з мэтай правядзення гэтага рашэння ў жыццё [9, л. 61].

Візіт В. Копа ў Варшаву не даў станоўчага выніку. Ні па аднаму з пытанняў, якія абмяркоўваліся на перамовах, не было дасягнута пагадненне. Л. Абаленскі быў адным з удзельнікаў гэтых перамоў. У лістападзе, калі магчымасць камуністычнага перавароту ў Германіі адпала, напружанасць у польска-савецкіх адносінах пайшла на спад. Гэта канстатаваў і Л. Абаленскі. У адказ на запыт НКЗС ён паведаміў 16 лістапада, што па агентурных дадзеных ніякай канцэнтрацыі польскіх войскаў супраць Германіі няма. Прычым ён выказаў здагадку, што гэтая дэзінфармацыя спецыяльна падкідваецца Берлінам, каб трымаць у напружанасці савецка-польскія адносіны [6, л. 214]. У пачатку 1924 г. Л. Абаленскі працягвае звяртаць увагу на тэндэнцыю да паляпшэння польска-савецкіх адносін. Ён паведамляе ў Маскву, што польскі ўрад імкнецца падкрэсліць пазітыўныя змены

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ў сваёй палітыцы ў адносінах да СССР. У якасці прыкладу такіх пераменаў ён указваў на тое, як праходзіла 14 лютага прадстаўленне дыпламатычнага корпуса новаму міністру замежных спраў Польшчы Маўрыкію Замойскаму. Савецкі паўпрад быў прыняты ў ліку першых і адзначаны "перад іншымі тым, што міністр гутарыў са мной каля паўгадзіны. Ветлівасць Замойскага была тая вялікая, што ён гутарыў са мной па-руску" [10, л. 32].

Праяўленнем тэндэнцыі да польска-савецкага збліжэння сталі перамовы аб гандлёвым дагаворы. Яны праходзілі галоўным чынам у Маскве, куды прыбыў новы польскі пасланнік Людвік Дароўскі. Таму Л. Абаленскаму не давялося на гэты раз прымаць у іх актыўнага ўдзелу. У канцы красавіка, калі стаў відавочны правал перамоў, ён толькі канстатаваў крайняе расчараванне правячых колаў Польшчы гэтым фактам і падкрэсліў, што "палякі прама перакананыя, што мы не хочам ісці на эканамічнае збліжэнне і супрацоўніцтва" [11, л. 33]. Л. Абаленскі паведамляў у Маскву 6 чэрвеня, што ў настроях у Варшаве зноў адбыўся пералом у адмоўны для СССР бок [11, л. 54]. Гэта была дастаткова трапная адзнака тых настрояў, якія дамінавалі ў Варшаве. Спашлемся на меркаванне таго ж Л. Дароўскага, які па выніках сваёй місіі ў Маскву пісаў, што стаўленне Савецкага Саюза да Польшчы будуецца на прадузятасці супраць яе, і Масква імкнецца трымаць адносіны паміж дзвюма краінамі ў пастаянным напружанні [11, л. 53].

Паўпраду ў Варашаве даводзілася вырашаць і задачу па прыцягненню ўвагі польскай грамадскасці да ўзбуйнення БССР. Яшчэ 7 жніўня 1923 г. В. Коп накіраваў тэлеграму Л. Абаленскаму, у якой указаў на тое, што "ў Польшчы дзіўным чынам прайшло зусім незаўважаным наша рашэнне рассунуць межы Беларусі на ўсход". Паўпраду даручалася "лансіраваць" гэтае пытанне сярод польскай грамадскасці, "супрацьпастаўляючы вызваленчую палітыку Саюза палітыцы прыгнёту нацыянальнасцяў у Польшчы" [9, л. 23–24]. Для савецкага ўрада была вельмі важнай рэакцыя на ўзбуйненне БССР у Польшчы. Са свайго боку, польскія правячыя колы імкнуліся зрабіць так, каб гэтая падзея не мела ў Польшчы значнага гучання, бо гэта садзейнічала б росту папулярнасці СССР сярод беларусаў у Польшчы. У сакавіку 1924 г. Л. Абаленскі ў адказ на запыт з Масквы пісаў, што польская прэса цалкам праігнаравала факт павелічэння тэрыторыі БССР [11, л. 4].

Перамены ў настроях польскага ўрада адносна СССР прывялі да расчаравання Л. Абаленскага ў сваёй місіі. Ён бачыў сваю задачу ў тым, каб дасягнуць паляпшэння польска-савецкіх адносін, праўда, на савецкіх умовах. Аднак летам 1924 г. прыйшоў да высновы, што дадзеная задача не можа быць вырашана ў бліжэйшы час. У склаўшыхся абставінах Л. Абаленскі 27 чэрвеня накіраваў у НКЗС тэлеграму, у якой прасіў аб адстаўцы. Матываваў ён сваю просьбу тым, што ў новых умовах у Варшаве патрэбен паўпрад з больш "моцнымі кулакамі" [11, л. 67–68].

**Крыніцы і літаратура**

1. Протокол заседания Политбюро № 3 от 21 марта 1921 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://sovdoc.rusarchives.ru/#showunit&id=58175;tab=img0048. – Дата доступа: 21. 09. 2018.

2. Протокол заседания Политбюро № 9 от 5 апреля 1921 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://sovdoc.rusarchives.ru/#showunit&id=58252;tab=img0074,0075. – Дата доступа: 01. 09. 2018.

3. Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 14 т. – М. : Наука, 1966. – Т. 4. – 559 с.

4. Телеграмма советника полпредства в Варшаве Наркому Иностранных Дел РСФСР. 12 декабря 1922 г. // Архив внешней политики Российской Федерации (АВПРФ). Ф. 04. – Оп. 32. – П. 211а. – Д. 133.

5. Протокол заседания Политбюро № 31 от 12 октября 1922 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://sovdoc.rusarchives.ru/#showunit&id=61025. – Дата доступа: 20. 10. 2017.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

6. Телеграмма Полномочного Представителя РСФСР в Варшаве Члену Коллегии Народного Комиссариата Иностранных Дел РСФСР. 9 января 1923 г. // АВПРФ. – Ф. 04. – Оп. 32. – П. 212. – Д. 52567.

7. Телеграмма Члена Коллегии Народного Комиссариата Иностранных Дел РСФСР Полномочному Представителю РСФСР в Варшаве. 14 января 1923 г. // АВПРФ. – Ф. 04. – Оп. 32. – П. 212. – Д. 52564. – Т. 1.

8. Протокол заседания Политбюро № 44 от 18 января 1923 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://sovdoc.rusarchives.ru/#showunit&id=61329;tab=img0052,0053. – Дата доступа: 29. 03. 2018.

9. Телеграмма Члена Коллегии Народного Комиссариата Иностранных Дел СССР Полномочному Представителю СССР в Варшаве. 12 октября 1923 г. // АВПРФ. – Ф. 04. – Оп. 32. – П. 212. – Д. 52565.

10. Телеграмма Полномочного Представителя СССР в Варшаве Члену Коллегии Народного Комиссариата Иностранных Дел. 15 февраля 1924 г. // АВПРФ. – Ф. 04. – Оп. 32.
– П. 213. – Д. 52595.

11. Телеграмма Полномочного Представителя СССР в Варшаве Члену Коллегии Народного Комиссариата Иностранных Дел. 9 мая 1924 г. // АВПРФ. – Ф. 04. – Оп. 32. – П. 213. – Д. 52596. – Т. 2.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ